**Аляксеева, М.** Прыміце словы ўдзячнасці за мужнасць / М. Аляксеева // Голас Расоншчыны. — 2007. — 13 лют. — С. 1.

**ПРЫМІЦЕ СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ ЗА МУЖНАСЦЬ**



***У лютым 1989 года апошнія савецкія салдаты з абмежаванага кантынгенту савецкіх войск пакідалі афганскую зямлю. Апошні раз, гледзячы на ўжо звыклыя, але як і раней небяспечныя горы, на бязлітасна гарачае летам сонца і смуглую, чумазую дзетвару, якая ўсё яшчэ з цікавасцю назірала за перамяшчэннем тэхнікі, у маладых мужчын у блакітных берэтах сціскалася сэрца. Усё. Кропка. Дамоў. Паваявалі. Але чаму так моташна на душы? Чаму хочацца крычаиь або... нават плакаць у плячо сябра?***

***Сярод тых, апошніх, быў сяржант 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі 350-га палка, дваццацігадовы Вячаслаў Уладзіміравіч Сенчанка.***

Пасля прыбыцця на пастаяннае месца дыслакацыі дывізіі ў Віцебск Вячаслаў яшчэ два с паловай месяцы спраўна служыў Айчыне і толькі 4 мая 1989 года быў звольнены ў запас і пераступіў парог роднай хаты. Першыя некалькі дзён ён проста «глухнуў» ад цішыні, а калі на 9 мая пачуў салют, у яго амаль што праявіўся выпрацаваны вайной рэфлекс самазахаванасці, і ён ледзь не ўпаў на зямлю. Хоць хутка ўзяў сябе ў рукі, аднак пазбавіцца ад нахлынуўшых пачуццяў не змог.

…У 1987 годзе малады тады яшчэ віцебскі хлопец разам з іншымі навабранцамі трапіў у Барысаў. Спачатку яго «сваталі» ў мотастралковыя войскі, але пасля прыбыцця групы будучых дэсантнікаў, якіх павінны былі рыхтаваць да службы ў Афганістане, планы Вячаслава рэзка змяніліся. Ён прапанаваў яшчэ 10 хлопцам паспрабаваць трапіць у гэтую групу. Пасля сур'ёзнага экзамену па фізічный падрыхтоўцы 6 сябрам усё же пашчасціла стаць дэсантнікамі.

Потым 5 месяцаў у вучэбным цэнтры таджыкскага горада Фергана, дзе хлопцы вучыліся скакаць з парашутам, рукапашнаму бою, валоданню ўсімі відамі стралковай зброі, якая выкарыстоўвалася ў Афганістане, і вось горад Кабул.

Як успамінае Вячаслаў Уладзіміравіч, за паўтара гады прабывання ў чужой краіне яму давялося паспрабаваць сябе ў розных сітуацыях: прымаў удзел у ваенных аперацыях, стаяў у ахове, займаўся прыкрыццём калон з грузам… Менавіта за апошняе атрымаў баявую ўзнагароду – медаль «За адвагу». Тая калона ў 46 машын з палівам рухалася праз цясніну. Яго БТР і яшчэ 4

адзінкі тэхнікі прыкрывалі важны груз. Раптам з-за кустоў пачуліся аўтаматныя чэргі, і дэсантнікі прынялі бой… Адстрэльваліся наўгад, бо праз «зялёнку» нічога нельга было пабачыць. Напэўна, рабілі яны гэта трапна, бо калона ўсё ж прайшла праз цясніны. Вячаслаў і яшчэ некалькі яго сяброў былі кантужаны, аднак, слава Богу, усе засталіся жывымі. На жаль, шанцавала так не заўсёды. Перад вачамі Вячаслава Уладзіміравіча і цяпер стаяць цынкавыя труны, дзе ляжалі 19-гадовыя хлопцы – яго аднапалчане, якія, як і ён, марылі вярнуцца жывымі дамой, абняць бацькоў і падарыць каханай букет самых прыгожых кветак. Але не вярнуліся.

З таго часу прайшло васемнаццаць доўгіх гадоў. І нават цяпер, абарочваюся назад, Вячаслаў Уладзіміравіч не шкадуе пра ўласнае рашэнне, нягледзячы на смерць і небяспеку, аддаць свяшчэнны доўг Радзіме на афганскай зямлі.

– Афганістан асабіста мне і нешта даў, і нешта забраў. Даў жыццёвы вопыт, менавіта там я стаў сапраўдным мужчынам, навучыўся цаніць мужчынскую дружбу, бацькоў, каханне, жыццё без выбухаў. Аднак ён забраў у мяне частку здароўя і «апрануў» сэрца ў браню, бо тое, што я бачыў, робіць чалавека зусім іншым.

У 2002 годзе члены раённага аб’яднання ветэранаў афганскай вайны абралі Вячаслава Уладзіміравіча сваім старшынёй, што для яго з’яўляецца і гонарам, і адказнасцю адначасова.

…Праз два дні, 15 лютага, па традыцыі «афганцы» плануюць сабрацца разам, каб успомніць былое, спець песні пад гітару і падняць баявыя сто грамаў за сяброў, якія не вярнуліся з той жудаснай і ўжо далёкай вайны. Прыміце і ад нас словы ўдзячнасці за вашу мужнасць і самыя найлепшыя пажаданні.

**М. Аляксеева**, фота аўтара